Малітва на кожны дзень (19)

Аўтар: Рэдакцыя
12.02.2017 00:00

Малітва за хворых і церпячых

Божа, Ойча наш, няхай Твой Провід чувае над хворымі і церпячымі, каб яны не марнавалі цярпення, а ўмелі яго ўплятаць у Тваю службу і далучалі яго да ахвяры Хрыста. Дай, Ойча найлепшы, усім пакутуючым ласку добрага, плённага перажывання болю, дадавай сіл і бадзёрасці, суцяшай, беражы, наколькі гэта магчыма, дазволь несці ім палёгку. Накармі іх, Ойча, Целам Твайго Боскага Сына. Жыві ў іх і будуй сваё Валадарства. Дазволь рэалізавацца пакліканням хворых, блаславі супольнасці хворых. Дазволь церпячым быць карыснымі для бліжніх і Касцёла. Няхай Дух Святы вядзе іх да святасці і вечнага шчасця.

Амэн.